✓З 13 красавіка ў галерэі «Атрыум» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі працуе выстава «Мікола Гусоўскі. Песня пра зубра», прымеркаваная да 500-годдзя з часу першага выдання паэмы.

Прадстаўнік новалацінскай паэзіі, адзін з заснавальнікаў жанру ліра-эпічнай паэмы ў літаратуры Усходняй Еўропы Мікола Гусоўскі стаў аўтарам паэмы «Carmen de statura feritate ac venatione Bisontis» – «Песня пра выгляд, лютасць зубра і паляванне на яго». Дзякуючы таленту і багатаму жыццёваму вопыту Гусоўскага паэма ператварылася ў песню сэрца паэта, гімн Бацькаўшчыне.

У экспазіцыі прадстаўлены выданні з фонду бібліятэкі, аб'яднаныя агульнай тэмай сюжэта паэмы, і работы беларускіх мастакоў, беларускіх і замежных магістрантаў, студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і навучэнцаў гімназіі-каледжа мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка.

Працуе выстава да 27 чэрвеня.

